**Шаноўныя калегі!**

Віншуем Вас з 45-годдзем з дня заснавання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў – нашай Alma mater, аднаго з самых творчых універсітэтаў краіны!

Да гэтай знамянальнай даты мы падышлі з заслужаным прызнаннем вынікаў працы, якія сталі магчымымі дзякуючы нашым выкладчыкам, супрацоўнікам, ветэранам, дзясяткам тысяч выпускнікоў, сябрам і калегам у Рэспубліцы Беларусь, краінах блізкага і далёкага замежжа!

Калектыў універсітэта зрабіў значны ўнёсак у фарміраванне культурнай эліты краіны, агульную справу ўмацавання нацыянальнай культуры – духоўнай асновы беларускай дзяржаўнасці.

Творчая супольнасць вядучых майстроў нацыянальнай культуры, сярод якіх заслужаныя артысты, дзеячы мастацтваў, культуры, народныя мастакі Беларусі, вядомыя навукоўцы, педагогі, маладыя прадстаўнікі інтэлектуальных і творчых сіл нашай краіны, імкнецца да захавання, прэзентацыі і папулярызацыі лепшых традыцый акадэмічнай адукацыі, беларускай навукі і культуры з улікам тэндэнцый, што адбываюцца ў краіне і свеце.

Сёння ўніверсітэт – вядучая ў сферы культуры Рэспублікі Беларусь установа адукацыі, якая ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў, што спалучаюць глыбокія спецыяльныя веды з грунтоўным досведам у галіне гуманітарных навук і творчай практыкі. Ён вядомы ў міжнароднай адукацыйнай прасторы і мае высокі статус сярод універсітэтаў краіны дзякуючы якаснай навуковай і інавацыйнай адукацыйнай дзейнасці, шырокамаштабнай мастацкай творчасці.

Жадаем далейшых поспехаў ва ўсіх нашых справах і пачынаннях, здароўя, дабрабыту, увасаблення задум у руплівай і плённай працы!

***Рэктарат***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ